# ВІНШУЕМ СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 5 МАЯ 1977 г.

№ 16(1166)

Цана 2 кап.



Когда мне говорят: Победа,
Я вижу звездный небосвод,
Многострадальная планета
По кругу вечному идет.
А над рекою, на пригорке,
Стоит, оглядывая ширь,
Солдат России, в гимнастерке,
Который спас от смерти мир.
Когда мне говорят: Победа,
Я вижу карту на столе,
Я вижу: сорок первый. Лето.
И первых павших на земле...
Победа нам далась не просто —
Нам было очень тяжело.
Немало полегло подростков,
Чтоб во Вселенной рассвело,
И рассвело! И сколько света
И счастья сколько на земле!
Когда мне говорят: Победа,
Я вижу Ленина в Кремле.

Семен ГУДЗЕНКО.

Москва, 5 мая 1946 г.

## ГЕРОІ КНІГІ Ў ГАСЦЯХ У ЧЫТАЧОЎ

Канферэнцыя чытачоў па кнізе С. Аслёзава «Взрыв на рассвете», прысвечаная 32-й гадавіне Вялікай Перамогі, адбылася ў БДУ. У госці да студэнтаў прыйшлі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны генерал-маёр у адстаўцы Павел Міронавіч Машэраў, палкоўнік у адстаўцы І. Марчанка, рэдактар выдавецтва «Беларусь» І. Аляксанаў, героі кнігі — генерал-маёр Г. Казанцаў, былы камісар брыгады «За Савецкую Беларусь», а затым камандзір брыгады імя Ракасоўскага А. Раманаў, аўтар кнігі, уласны карэспандэнт газеты «Советский патриот» С. Аслёзаў, у мінулым студэнт гістарычнага факультэта БДУ.

Выкладчыкі і студэнты, ветэраны вайны прынялі ўдзел у абмеркаванні кнігі аб гераічнай барацьбе падпольшчыкаў і партызан Расоншчыны, баявой дзейнасці ў варожым тыле кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ, Героя Савецкага Саюза Пятра Міронавіча Машэрава, былога камандзіра атрада імя Шчорса, а потым камісара партызанскай брыгады імя Ракасоўскага.

Канферэнцыя, арганізаваная грамадскімі арганізацыямі механіка-матэматычнага факультэта, кафедрай рускай савецкай літаратуры сумесна з работнікамі універсітэцкай бібліятэкі, з'явілася важным мерапрыемствам у ідэйна-палітычным і ваенна-патрыятычным выхаванні студэнтаў.

Увазе ўдзельнікаў канферэнцыі была прадстаўлена кніжная выстаўка «Непакораная Беларусь».

## МОЦНАЯ ДРУЖБА

Служачых Савецкай Арміі і студэнтаў-фізікаў нашага універсітэта звязвае даўняя моцная дружба. Камсамольская работа вядзецца па сумеснаму плану, праводзяцца агульныя вечары адпачынку.

9 мая аўтобус паімчыць студэнцкую агітбрыгаду ў Станькава. І зноў сустрэчы з сябрамі, размовы аб тым, што зроблена і што яшчэ трэба будзе зрабіць. Напярэдадзе рабят чакаюць спартыўныя спаборніцтвы, у якіх яшчэ невядома каму прыйдзецца цяжэй: будучыя фізікі займаюць першыя месцы ва універсітэце па радыёспорту і стральбе. Аб гэтым мне расказаў член камітэта камсамола фізічнага факультэта Дзмітрый Русаковіч.

Шэфская работа — гэта не адзінае, што ўваходзіць у сферу дзеяння сектара. З поўнай адказнасцю падыходзяць студэнты да правядзення урокаў мужнасці, якія звычайна праходзяць у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. На факультэце часта праводзяцца канферэнцыі чытачоў, прагляды фільмаў на ваенна-патрыятычныя тэмы, здзяйсняюцца паходы па месцах баявой славы.

У гэтым годзе на факультэце утварылася група «Доўг». І адразу ж паляцелі пісьмы ва ўсе куткі нашай рэспублікі, пісьмы, якія адшукваюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — выпускнікоў фізічнага факультэта БДУ.

А. ГАЛАВАЧОВА.

## УНІВЕРСІТЭТ НА СВЯТОЧНАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ



Мінск, 1 мая 1977 года.

Фота В. Дудко і А. Цыбулькі.



# У СВЯТЛЕ ПАСТАНОВЫ

**Споўнілася два гады з таго часу, калі была апублікавана пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы журналісцкіх кадраў». Аб тым, якія змены адбыліся ў сістэме падрыхтоўкі журналістаў, што новага ўнесена ў вучэбны працэс на факультэце, мы папрасілі расказаць яго дэкана, доктара гістарычных навук, прафесара Р. В. БУЛАЦКАГА.**

Вось што ён сказаў:

— Па пытаннях падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў было прынята рашэнне калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «Аб якасці падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у ВНУ Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі УССР у святле пастановы ЦК КПСС ад 20 студзеня 1975 г. «Аб мерах па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы журналісцкіх кадраў», а таксама на калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

У адпаведнасці з прынятай пастановай вялікая ўвага на факультэце журналістыкі была ўдзелена набору студэнтаў на стацыянар, а таксама на завочную і вячэрнюю формы навучання. Сумесна з Саюзам журналістаў дэканат арганізаваў паездкі выкладчыкаў і работнікаў рэдакцый газет, часопісаў, радыёвяшчання і тэлебачання па раёнах Беларусі. Усяго было паслана каля 70 чалавек. К часу ад'езду выкладчыкаў былі надрукаваны ўмовы прыёму на факультэт журналістыкі, размножана і разаслана ва ўсе рэдакцыі, школы, на прадпрыемствы, у калгасы, саўгасы палажэнне аб творчым конкурсе.

Як у мінулым, так і ў гэтым годзе была сфарміравана камісія з выкладчыкаў факультэта журналістыкі і журналістаў-практыкаў, якія правялі вялікую работу. Дастаткова сказаць, што за час удзелу у апошніх двух наборах студэнтаў імі было прачытана звыш трох тысяч матэрыялаў абітурыентаў.

У выніку на факультэт журналістыкі залічана ў асноўным палітычна адукаваная, актыўна ўдзельнічаючая ў грамадскім жыцці і маючая здольнасці да журналісцкай работы моладзь.

Увесь вучэбны працэс пабудаван у адпаведнасці з новым вучэбным планам. Студэнты I, II і III курсаў займаюцца па новаму вучэбнаму плану. Значная ўвага была ўдзелена павышэнню ўзроўня лекцый, правядзенню практычных заняткаў па гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі, якая стала чытацца з чацвёртага семестра, навуковаму камунізму і ўсіх спецыяльных дысцыплінах. Шмат увагі ўдзяляецца эканамічнай падрыхтоўцы будучых журналістаў. Распрацаваны і чытаюцца новыя курсы: «Асновы эканомікі і гаспадарчай дзейнасці сацыялістычных прадпрыемстваў», «Навуковыя асновы кіравання і планавання народнай гаспадаркі», «Навуковыя асновы прапаганды і метады ідэалагічнай работы», «Сацыяльная псіхалогія», «Уводзіны ў журналістыку». «Крытыка тэорыі і практыкі буржуазнай журналістыкі».

Падрыхтаваны і чытаюцца спецкурсы: «Нарыс і фельетон», «Актуальныя пытанні публіцыстыкі», «Эканамічная палітыка КПСС», «Актуальныя пытанні радыёвяшчання і тэлебачання» і іншыя.

Для студэнтаў IV курса арганізавана новая форма прафесійнальнага навучання: індывідуальная работа па журналісцкаму майстэрству, якую праводзяць найбольш кваліфікаваныя работнікі рэдакцый газет і часопісаў, Дзяржтэлерадыё БССР.

З улікам новых патрабаванняў кафедрамі былі перагледжаны тэматыка курсавых і кантрольных работ, праграмы курсаў і спецкурсаў. Палепшылася выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання.

Вялікая ўвага ўдзяляецца арганізацыі і правядзенню азнаямленчай, вытворчай і пераддыпломнай практыкам. Распрацаваны новыя праграмы практык. На факультэце вядзецца бесперапынная круглагадавая практыка, сутнасць якой заключаецца ў тым, каб планавая практыка ў рэдакцыях газет, радыёвяшчання і тэлебачання ўлівалася ў адзіны працэс з практычнымі заняткамі па курсах тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі і тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання.

Дэканат, партбюро, грамадскія арганізацыі пастаянна паляпшаюць навукова-даследчую работу на факультэце. З часу прыняцця пастановы ЦК КПСС выкладчыкамі факультэта апублікавана 11 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. А ўсёй друкаванай прадукцыі — звыш 170 д. а. Манаграфіі, брашуры, навуковыя артыкулы з'яўляюцца вучэбнымі дапаможнікамі для студэнтаў факультэта. Дэканатам і кафедрамі праароблена пэўная работа, накіраваная на ліквідаванне шматтэм'я ў навукова-даследчай рабоце. Аб гэтым сведчыць той факт, што замест 26 тэм у дзевятай пяцігодцы, над якімі працавалі выкладчыкі, цяпер працуюць над 8 тэмамі.

Палепшылася навукова-даследчая работа студэнтаў. За час, які прайшоў з дня прыняцця пастановы ЦК КПСС, праведзены тры студэнцкія навуковыя канферэнцыі, на якіх было заслухана 177 дакладаў. Арганізавана і актыўна прайшла ў гэтым годзе XXXIV канферэнцыя. Як адзначалася на пленарным пасяджэнні, значна павысіўся ўзровень дакладаў.

Умацаваліся сувязі факультэта з рэдакцыямі газет, тэлебачання і радыёвяшчання,

Прафесарска-выкладчыцкі састаў рэгулярна праходзіць стажыроўку ў рэдакцыях рэспубліканскіх газет, на тэлебачанні і радыёвяшчанні.

# СЁННЯ — ДЗЕНЬ ДРУКУ

**У будучым яны стануць рэдактарамі, карэспандэнтамі, літсупрацоўнікамі. А пакуль што поле іх дзейнасці — насценны друк.**

**Рэдкалегія газеты «Журналіст» за работай.**



**Выпускнік журфака — баец ідэалагічнага фронту. Вось чаму пытанням маралі і эстэтычнага выхавання заўжды ўдзяляецца штодзённая ўвага. Па добрай даўняй традыцыі студэнты запрашаюць да сябе ў госці вядучых журналістаў, пісьменнікаў, дзеячоў навукі і культуры. Паэт Г. Бураўкін, драматург А. Макаёнак, кампазітар і мастак Людміла Шлег — вось далёка не поўны пералік тых, з кім сустракаліся журфакаўцы ў апошні час.**

## ФАКУЛЬТЭТ НАШ — ТВОРЧЫ

**А мастацкая самадзейнасць? Шмат працы і часу аддалі факультэцкія «артысты» падрыхтоўцы канцэрта да агульнаўніверсітэцкага агляду-конкурсу. І як вынік — заслужаная перамога. Зноў праз год заваявана пачэснае першынство.**

**Студэнты — самыя нястомныя і энергічныя людзі. Вучоба, адпачынак, бібліятэка, турпаходы... І побач з гэтым — актыўная навукова-даследчая работа. Актыўная: 63 цікавыя даклады былі заслуханы нядаўна на студэнцкай канферэнцыі.**

**Бібліятэка, гітара ў начы, цікавыя дыспуты і зноў вучоба... Так, асноўны час аддаецца ёй. Час, які заўжды праходзіць творча і прадуктыўна. Ці не аб гэтым гаворыць трэцяе месца па выніках зімовай сесіі!**

**...Кіруючыся пастановай ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў», наш факультэт жыве напружаным, разнастайным і насычаным жыццём. Напярэдадні юбілею дружны калектыў працуе яшчэ з большым натхненнем і ўздымам.**

**Т. ВОЛКАВА.**

## СПОРТ І ЖУРНАЛІСТЫКА

Глыбей пранікнуць у цудоўны свет спорту дапамагае нам спартыўная журналістыка. Прыемна, што ў апошні час ад простай канстатацыі лічбаў і фактаў журналісты пераходзяць да ўсебаковага аналізу, да вывучэння чалавечай псіхалогіі. Дастаткова назваць Уладзіміра Маслачэнку, Станіслава Токарава, Ніну Яроміну, Мікалая Озерава, Лідзію Барадзіну, Уладзіміра Снегірова, Барыса Фядосава. У цэнтры іх рэпартажаў, карэспандэнцый, замалёвак, артыкулаў перш за ўсё — асоба.

Спорт і асоба... Спорт фарміруе, дапамагае выразіцца асобе. Ірына Радніна — каралева фігурнага катання, агонь і вецер, запальнасць і хуткасць. Як праўдзіва, эмацыянальна, лірычна расказаў аб Радніной Станіслаў Токараў («Негладкий лёд», «Огонёк», № 11, 1977).

Вы памятаеце рэпартажы Лідзіі Барадзіной з Алімпіяды-76 у Інсбруку? Здзіўляе майстэрства журналісткі, якая за 2 хвіліны горналыжнага спуску паспявала пазнаёміць тэлегледачоў з біяграфіяй спартсменаў, перадаць абстаноўку вострага спаборніцтва, напружанай барацьбы, выказаць свае адносіны да таго, што адбываецца.

Пазіцыя журналіста павінна быць дакладнай і яснай. Менавіта такую пазіцыю заўсёды займаюць Уладзімір Маслачэнка, Мікалай Озераў, Ніна Яроміна. Мікалай Озераў... Спартсмен, артыст, каментатар. Неаднаразовы чэмпіён краіны па тэнісу, папулярны акцёр МХАТа, больш 20 гадоў вядзе ён рэпартажы з сусветных чэмпіянатаў, заканчваючы якія, сціплай скарагаворкай вымаўляе: «Вёў рэпартаж Мікалай Озераў». Сапраўды, чалавек сэрца і таленту.

Мне надоўга запомніцца сустрэча са спартыўным карэспандэнтам «Комсомольской правды» Уладзімірам Снегіровым. Абаяльная знешнасць, дзелавітасць, прыемны голас — усё выклікае прыхільнасць да яго. Снегіроў расказвае аб зімовай Алімпіядзе-72 у Сапара, аб спецыфіцы работы спартыўнага журналіста за мяжой. Ім, спартыўным журналістам, прыходзіцца нялёгка. Адбываецца маса падзей, за якімі трэба паспець. Прычым аб шматлікіх закулісных падзеях чытачу ж не раскажаш.

Я зараз з цікавасцю сачу за спартыўным аддзелам «Комсомольской правды». Мне спадабаліся апошнія выступленні Снегірова — рэпартажы з Токіо, з чэмпіяната свету па фігурнаму катанню.

Як правіла, найбольш глыбока і поўна расказваюць аб спорце тыя людзі, якія непасрэдна сутыкаліся з ім. «Советский спорт» ахвотна друкуе Юрыя Уласава (вядомы штангіст, алімпійскі чэмпіён, пісьменнік, інжынер па прафесіі), Галіну Сцяпанаву (алімпійская чэмпіёнка па плаванню, журналістка).

Мы шмат атрымліваем для сябе з матэрыялаў вядучых спартыўных журналістаў. Гэта новыя, заўсёды захапляючыя сустрэчы з непаўторнымі імгненнямі спартыўнай барацьбы, сустрэчы з героямі водных дарожак і лыжных трас, майстрамі дывана і скураной пальчаткі, рыцарамі льду і вострага клінка. Падзякуем нашай спартыўнай журналістыцы за гэтыя сустрэчы.

**З. РУСАКОВІЧ,**
**студэнтка III курса журфака.**



**Здаецца, зусім нядаўна прыйшлі мы на журфак, а ўжо засталіся ў мінулым і наш першы семестр, і першыя адзнакі ў залікоўцы.**

**Цяпер мы адчуваем сябе больш упэўнена, і нас не палохаюць ні тэлекамера, ні «Рэпарцёр-5», ні іншыя атрыбуты журналіста. А хутка ў эфіры прагучаць першыя вучэбныя радыёперадачы, зробленыя першакурснікамі.**

**НА ЗДЫМКУ: Віктар ДУДКО за мантажом вучэбнай радыёгазеты.**
**Фота І. ГАЎРЫЦКАГА.**

## УВАГА: КОНКУРС!

**16 мая 1977 года ў памяшканні галоўнага корпуса універсітэта адбудзецца агляд-конкурс «Камсамольскіх пражэктараў».**

На конкурс факультэты падаюць 2 нумары «КП» з адпаведнай дакументацыяй (акты рэвізій, праверак, сігналаў «КП», рэагаванні).

Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу камісія будзе звяртаць увагу на змест, афармленне нумароў, на актуальнасць закранутых пытанняў, баявітасць і практычныя рэкамендацыі.

Старшыні штабаў «КП» павінны прадставіць нумары «КП» 12 мая з 14 да 17 гадзін у камітэт камсамола журфака.

Састаў камісіі па падвядзенню вынікаў агляду-конкурсу:

1. **В. Рошчын** — супрацоўнік газеты «Беларускі універсітэт»;
2. **В. Лодаў** — старшыня штаба «КП» БДУ;
3. **В. Русак** — намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ;
4. **А. Зельдзін** — загадчык сектара галоснасці штаба «КП» БДУ.

Пераможцы будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі і граматамі камітэта камсамола.

**Камітэт камсамола БДУ,**
**штаб «КП».**

**В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.**

НАШ АДРАС
Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.